**«ГУ́ТАРКА Ў КАРЧМЕ́, СПІСА́НАЯ КАНДРУСЁМ З-ПАД ДО́КШЫЦ»**, ананімны вершаваны твор бел. л-ры апошняй чвэрці 19 ст. Пад тэкстам пазначана дата: «1891 г. ліпеня 20 д. Людвінаў», таксама змешчаны аўтограф: «Кандрусь з-пад Докшыц». Упершыню цалкам апубл. ў час. «Полымя» (1956, №2). Пабудавана ў форме некалькіх маналогаў. Пяцёра сялян (Аляксей, Пётр, Габрусь, Хрол і Ігнат), спыніўшыся ў карчме, распавядаюць пра беззямелле, беднасць і бяспраўе мужыка. Аляксей патрабуе справядлівасці, выказваецца супраць панскай усёдазволенасці. Пётр з Габрусём даводзяць прадажнасць царскага суда, у якім валадараць не Закон і Праўда, а грошы і гарэлка (суддзі «сядзяць для формы, як бы каўпакі, // <...> засудзяць цябе і без віны»). Валацуга Хрол абяцае хуткі перадзел зямлі, пра што ён нібыта чуў у Пецярбургу. Аднак кропку ў размове паставіў стары і працавіты Ігнат, які давёў сялянам, што болей зямлі не будзе, рабіць трэба на той, якая ёсць. Ігнат прычыну сялянскай галечы бачыць не столькі ў беззаконні і несправядлівасці, колькі ў злоўжыванні гарэлкай і ў гультайстве («трэба лепей працаваць // На той [зямлі], што бацька мой надзяліў»). У творы ўсё яшчэ адчуваецца моцная вера ў добрага цара, аднак вера ў паноў ужо канчаткова страчана. Гутарка адлюстроўвае настроі бел. сялян у

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.Кулешова

парэформеннай вёсцы, дзе выспявалі ў т.л. і рэв. настроі. *В.І.Еўмянькоў.*

...й архив библиотеки МГУ имени А.